**“Бібліятэка К.Я. Грота: збор кніг рускага вучонага-славіста ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі” (2017–2020 гг.)**

Мэта работы – выяўленне найбольшай колькаснай паўнаты друкаваных экзэмпляраў выданняў з былога прыватнага кнігазбору вучонага-славіста Канстанціна Якаўлевіча Грота (1853–1934) у фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і іх навуковае апісанне ў фармаце БЕЛМАРК.

Бібліятэка аднаго з зачынальнікаў славяназнаўства К.Я. Грота паступіла ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 1925 г. Частка экзэмпляраў была згублена падчас Другой сусветнай вайны. На сёння сабраная і апрацаваная калекцыя налічвае звыш 800 экзэмпляраў кніг, сотні экзэмпляраў замежных навуковых часопісаў. Кожнаму экзэмпляру прысвоены калекцыйны нумар. Кнігазбор з’яўляецца каштоўнай дакументальнай крыніцай для гісторыкаў, літаратуразнаўцаў, моваязнаўцаў, этнографаў, даследчыкаў станаўлення дзяржаўнасці славянскіх краін і ўнікальных моў іх нацый, першых твораў нацыянальных літаратур. Частка кніг перайшла К.Я. Гроту з бібліятэкі яго бацькі – вядомага расійскага філолага, акадэміка Якава Карлавіча Грота (кнігі другой паловы XVIII – пачатку XX ст.). Калекцыя багатая на кнігі і брашуры з дароўнымі надпісамі іх аўтараў, перакладчыкаў, выдаўцоў – філолага Я.Ф. Карскага, гісторыка царквы І.С. Пальмава, моваведа Н.М. Пятроўскага, фальклярыста П.В. Шэйна і інш. Частка кніг калекцыі даступна ў алічбаваным выглядзе.